**Скоп, В.** Афганскі боль жыве ў памяці і сэрцах / В. Скоп // Голас Расоншчыны. — 1997. — 21 лют. — С. 2.

## АФГАНСКІ БОЛЬ ЖЫВЕ Ў ПАМЯЦІ І СЭРЦАХ

***Без перабольшвання можнаназваць вялікай школай выхавання грамадзянскай адказнасці, мужнасці і патрыятызму службу нашых землякоў у так званым абмежаваным кантынгенце савецкіх войскаў у Афганістане. Там кожны дзень падсцерагала смерць. Але каваліся і майстэрства, вывучка, а кожны бой з душманамі станавіўся суровым выпрабаваннем маральна-псіхалагічных і баявых якасцей для салдат і афіцэраў. І ў самых нечаканых і цяжкіх сітуацыях яны не падалі духам, ішлі на рызыку, праяўлялі ўзаемавыручку, узаемадапамогу, гатоўнасць у што б ні стала выканаць пастаўленую задачу. Гэтыя якасці ва ўсе вякі лічыліся рысамі характару сапраўдных воінаў.***

***Сярод тых, хто прайшоў праз афганскую вайну, было 45 сыноў Расоншчыны. Не ўсе яны вярнуліся жывымі, цяпер на тэрыторыі раёна іх жыве 39. І разам з імі мясцовая ўлада, грамадскасць штогод 15 лютага адзначаюць Дзень воінаў-інтэрнацыяналістаў, ушаноўваючы мужнасць жывых і памяць загінуўшых. Такія мерапрыемствы прайшлі ў Расонах і сёлета.***

У мінулую суботу былыя воіны-«афганцы» сабраліся зноў у Расонах разам, каб проста пагутарыць, даведацца, як хто жыве, успомніць сяброў, якіх ужо няма. Многія былі з жонкамі. На сустрэчу прыехалі бацькі загінуўшых Сяргея Каралькевіча і Мікалая Беладзеда, Васіля Лазарэнкі, лёс якога і па сённяшні дзень невядомы.

З памятным для ўсіх сабраўшыхся днём ад імя райвыканкама павіншавала загадчыца аддзела па рабоце з насельніцтвам Н. В. Канарская. Яна пажадала прысутным усяго самага светлага і радаснага ў жыцці, папрасіла выказаць просьбы, калі яны ёсць.

Аднак пытанняў ні ў каго не было. Жыллём усе забяспечаны, ёсць патрэбы толькі ў яго паляпшэнні. Іншыя пытанні вырашаюцца ў рабочым парадку, не накопліваючыся да падобных сустрэч.

Потым усе накіраваліся ў царкву, дзе была праведзена паніхіда па загінуўшых воінах. Ціхія слёзы каціліся з вачэй маці, стаялі яны і ў вачах кожнага прысутнага тут…

Што яны думалі ў гэты дзень? Аб чым успаміналі? Пра гэта некалькі раней я спытала ў некаторых «афганцаў».

**Вось што сказаў Уладзімір Васільевіч Зуеў:**

– Памятаю, як яшчэ школьнікам часта прасіў дзеда Паўла Пятровіча расказаць пра вайну. Не мог зразумець, злаваўся, чаму ён не хоча гэта рабіць, а калі і расказвае, то вельмі скупа, нехаця.

Дзеда даўно ўжо няма, цяпер мяне просяць расказаць, як я ваяваў, толькі на другой вайне. Вось калі я зразумеў дзеда! Ну што расказваць пра вайну? Ці зможа нармальны чалавек без болю ў душы гэта рабіць? Ды і навошта? Што добрага там было?

Да арміі я працаваў трактарыстам у калгасе «Чырвоны партызан». Трапіў у танкісты, стаў механікам-вадзіцелем. У Афганістане выпала служыць паблізу горада Шыбергана. Нашай задачай была ахова і суправаджэнне калон з грузамі.

Аднойчы мы суправаджалі калону машын праз перавал. Правялі нармальна, вярталіся назад. Кіламетрах у двух ад кішлака спыніліся на прывал. І тут ударылі буйнакаліберныя кулямёты.

Усе кінуліся па машынах. Мой экіпаж, два беларусы і два ўкраінцы, быў на месцы. Я завёў матор. І тут кулямётная чарга секанула па брані, веерам пырскнулі асколкі, упіліся мне ў руку, рассеклі твар. У шоку не адчуваў болю.

Экіпаж мой сядзеў у асобным адсеку, перавязаць мяне ці чым дапамагчы не было каму. Адчуваў, што кроў льецца па твары, залівае правае вока. Але ж трэба як хутчэй выбірацца з-пад абстрэлу, і я, змахваючы рукавом кроў з твару, гледзячы толькі левым вокам, вёў танк. Разам з крывёю выцекла і пабітае асколкам вока.

Затым былі шпіталі ў Кабуле, Ташкенце, Падольску. Вайна для мяне закончылася. Цяпер мне 32 гады, маю сям'ю, 2 дзяцей, працую ў калгасе. Хачу, каб дзеці ніколі не зведалі тое, што бачыў я.

**Расказвае Вячаслаў Сенчанка:**

– У вучэбным батальёне перад Афганістанам нас нядрэнна рыхтавалі, былі нават цэнтры псіхалагічнай падрыхтоўкі. І ўсё ж вайна сустрэла зусім не такой, якую мы ўяўлялі. Там не было фронту, лініі абароны. Палявалі снайперы. Куля, граната маглі вылецець з кожнага кутка. Таму ўсе знаходзіліся ў пастаянным напружанні. З аднаго з заданняў байцы прынеслі літаральна рэшткі, астанкі нашага камандзіра, які ў вольны час пісаў песні, і якія я і сёння спяваю.

Запомніліся жорсткія баі за Хост. Асабліва цяжка даводзілася, калі натыкаліся на «белых буслоў» – пакістанскі спецназ. Там я прывык да болю. Даводзілася быць бязлітасным у баі.

За аперацыі «Магістраль», за баі ў Кабуле, Джалалабадзе ўзнагароджаны медалём «За адвагу», афганскімі «Воінская доблесць», «Афганская звязда». Цяпер, успамінаючы той час, прыходжу да вываду, што ўсё ж лепш мець армію прафесійную і каб салдаты былі не маладзей хоць бы 22 гадоў, бо ў 18–19 цяжка перажыць страты, ацаніць, разабрацца ў абстаноўцы.

Сёння былыя «афганцы» не падтрымліваюць ніякую палітычную партыю, бо пабывалі ўжо ахвярамі палітычных гульняў. Я падтрымліваю палітыку нашага Прэзідэнта А. Р. Лукашэнкі і задаволены ёю. Трэба навесці парадак у рэспубліцы, і ніколі не спрабаваць наводзіць яго ў чужых краінах.

У многіх з маладых ветэранаў на грудзях паблісківаюць медалі «За адвагу», афганскія ўзнагароды. Напрыклад, на пінжаку Валерыя Аўласенкі сярод іншых узнагарод ёсць і медаль «За баявыя заслугі». Служыць яму выпала ў 1986–1988 гадах у Кабуле. Пасля прызыву некалькі месяцаў вучобы ў Фергане, а потым маладым салдатам аб'явілі, што яны паляцяць у Афганістан. На пытанне, як яны ўспрынялі такое паведамленне, Валерый адказаў:

– З энтузіязмам. Для нас гэта было вельмі рамантычна. Тыя з рабят, чыіх прозвішчаў не назвалі, тут жа пісалі рапарты з просьбай паслаць на вайну. Мы ўсе свята верылі, што абараняем інтарэсы сваёй Радзімы. А калі прыляцелі, то адчуванне было такое, нібыта ўсё гэта ў кіно.

Валерый быў вадзіцелем. Па горных дарогах дастаўляў боепрыпасы. Дарогі – сапраўдны серпантын. 3-кіламетровы пад'ём на перавале Саланг. Калона з небяспечным грузам расцягнулася на кіламетр. Пярэдняя машына раптам пакацілася назад, уніз. Відаць, у матора не хапіла магутнасці адолець пад'ём і ён захлібнуўся. Раздумваць няма калі. Валерый хутка «злавіў» той грузавік, падпёршы яго сваім. Канечне, ён рызыкаваў і сам апынуцца ў бездані. Але быў упэўнены, што калі пакоціцца і яго машына, яе падтрымае задняя. Такія вымушаныя «счэпкі» з 2–3, а то і 4

машын ён ужо бачыў на горных дарогах. Вельмі наглядны сувораўскі прынцып «сам погибай, а товарища выручай».

Медаль «За адвагу» ўпрыгожвае і грудзі Аляксандра Рубашэнкі. Ён – за бой пад Кандагарам. У той дзень на штурм хадзілі некалькі разоў. Сябры гінулі на вачах. Хто згарэў у БТРы, каго «знялі» снайперы, каго разарвала гранатай, а яму пашанцавала, толькі крыху пасекла асколкамі.

Міхаіл Іваноў – дэсантнік, камандзір аддзялення мінамётчыкаў. У асноўным па зададзеных каардынатах вёў агонь па ворагу. Бывалі выпадкі, калі нашы салдаты траплялі ў такое становішча, што прасілі агонь на сябе...

Ды ці варта пералічваць, у каго якія ўзнагароды? Гэтага не любяць і самі ветэраны той вайны. Кожны, хто перажыў тое пекла, варты любых узнагарод. У Афганістане загінула трое нашых землякоў, а 4 не стала ўжо дома.

За святочным сталом удзельнікі сустрэчы многае ўспомнілі. Спявалі песні, свае і тых, каго ўжо няма. Шмат цёплых слоў было сказана ў адрас салдацкіх маці. Цяжка было ўстрымацца ад слёз на гэтым свяце. Ды тут іх ніхто і не хаваў...

Па-рознаму склаліся лёсы былых салдат, аднак іх і цяпер яднае нешта агульнае. Гэта асаблівы стан душы, сваё бачанне жыцця, асаблівая школа жыццёвых каштоўнасцей. Таму ім вельмі няпроста і сёння. Няхай жа хутчэй забудуць яны пра вайну. Няхай ствараюць сем’і, расцяць і выхоўваюць дзяцей, сустрэнуць вялікае шчасце.

Міру вам, здароўя, самага светлага ў жыцці, дарагія нашы героі!

**В. Скоп**